Источник: **«Звязда» - 2012-09-13**

## Беларускія елкі растуць у Швецыі

**Каля 30% лесу ў Швецыі вырашчана з беларускага насення, паведаміў дырэктар** Інстытута лесу НАН Беларусі **Аляксандр Кавалевіч, перадае БЕЛТА.**

На поўдні краіны гэтая лічба значна вышэй — каля 70%. "Прадуктыўнасць нашай елкі на 25% вышэй за іх уласную. За апошнія 40 гадоў у Швецыю было экспартавана прыкладна 150 т насення еўрапейскай елкі. Сёння 1 кг насення каштуе прыкладна 200 еўра. Гэта значны экспартны патэнцыял", — адзначыў Аляксандр Кавалевіч.